# Ад рэдактара

Каляды. Чалавеку гэта здаецца *архаікай*.

Пад рукой ляжыць каляндар. У ім пазначаны даты. У гэтых датах ёсьць нешта такое, што хвалюе людзей. Чалавек узрушаецца таму, што каляндар паказвае на час, у які мы жывём. Узяць у рукі каляндар — азначае зважаць на тое, што такое сучаснасьць, што было раней і што будзе пасьлей. На сьцяне вісіць каляндар.

Гэты нумар нашага часопісу прысьвечаны своеасаблівай *археалёгіі* часу — нас цікавіць, што плыве на яго хвалях. Гэта можа быць пыл, мул, але, разам з тым, і нешта іншае. З усяго гэтага мы складаем абраз, які ўносіцца ў наш *архіў*.

Што стаіць за смугой часу? — Мы часта чуем словы. Бальшыня гэтых словаў адсутная і, больш таго, нават вымкнутая з нашага супольнага культурнага архіву. Такімі словамі ёсьць і «постмадэрн», «постмадэрнізм».

Каб не выкоўзвацца — ня быць вымкненымі — з часу, каб ня быць архаічнымі, мы мусім неўпрыцям для сябе ўкладаць у іх пэўны сэнс.

Магчыма, «постмадэрн» — гэта тэлевізія, цыркуляцыя і каналізацыя, магчыма, гэта маўчаньне дзядоў і *анархізм*. Нам, *архівістам*, у гэтым калейдаскопе падзеяў важнае адно: як, пабыўшы з аднаго боку прасторы, у якой перабывае сэнс, лучыць на другі яе бок.

Быўшы там пілігрымамі і *ан–архістамі*, будзем жа тут турыстамі і архівістамі.

Архаіку чуць чуць.

*Валерка Булгакаў*